выткала яна прыгожых посцілак і ручнікоў, з імі яна ўдзельнічала ў раённых і абласных выставах, на розных святах і фестывалях. Зараз мая сястра на заслужаным адпачынку, даглядае старую маці і гадуе ўнукаў.

Мне давялося працаваць ў філіяле ДУК «Акцябрскі раённы дом рамёстваў» метадыстам-майстрам, кірую гуртком дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Іскрынкі майстэрства». Мае навучэнцы вучацца не толькі вышываць і плесці паясы ад мяне, але і асвойваюць такія віды мастацтва, як арыгамі, квілінг, пляценне з папяровых трубачак, выраб лялек абярэгаў з нітак і з тканіны, працуем з прыродным матэрыялам. Асаблівую ўвагу ўдзяляем такому віду мастацтва, як выцінанка. Мае малодшыя сёстры не абралі сабе творчыя прафесіі, але ў вольную хвіліну любяць займацца любімай справай, павышываць, або павязаць на спіцах. Сваё ўменне мы перадаём сваім дзецям і ўнукам і спадзяёмся, што працяг будзе.

Аляксей РАГУЛЯ
*(г. Мінск)*

## ФАЛЬКЛОРНЫ ДЫСКУРС

Эпохі крызісаў у гісторыка-культурным працэсе з'яўляюцца такой жа заканамернасцю, як і эпохі тэхнічнага прагрэсу. Сучасны крызіс духоўных і сацыяльных каштоўнасцей разгортваецца на фоне інтэнсіўнага прагрэсу ў тэхніцы і тэхналогіі. Біфуркацыя такога кшталту часта выкарыстоўваецца зацікаўленымі сіламі ў ідэалагічных мэтах і стрымлівае пошук ісціны і выйсця з крызіснага стану. Ва ўмовах сучаснай глабалізацыі ўзрастае значэнне і роля супольнай працы розуму і духу ўсёй чалавечай супольнасці. На шляху інтэнсіўнага пошуку выйсця з тупіковай сітуацыі сёння з'яўляецца кансерватызм масавай свядомасці – сіндром актыўна пашырацца ва ўсіх слаях соцыуму і фарміруе стыль абыякавасці ў адносінах да вышэйшых каштоўнасцей, да самога факту аднаразавага ўласнага існавання.

Гісторыя чалавечага духу пераконвае нас у тым, што выйсце з падобных сітуацый чалавецтва знаходзіла тады, калі мудрацы і прарокі станавіліся змагарамі за вызваленне душы суачынніка з д'яблавых рук. Так было ў сярэдзіне і другой палавіне першага тысячагоддзя да новай эры, калі чалавецтва паставіла перад сабой задачу выйсця з паласы ваяўнічых царстваў і княстваў у новую гістарычную рэальнасць. Монатэізм пракокаў адлюстраваў новы патэнцыял чалавека ў яго гістарычнай творчасці. Аднак гэты рэсурс царкоўным чынавенствам у саюзе з імператарскай іерархіяй хутка быў ператвораны ў манапольную форму ўласнасці для кіраўнічай вярхушкі. Сутнасць ісціны тагачасныя ідэолагі пастараліся растварыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у тумане показкаў пра трансэндэнтнага і абавязкова антрапаморфнага творцу Быцця і, галоўнае, уладара чалавечых лёсаў.

Побач з праўладным дыскурсам монатэізму, у аснову якога пакладзена сакралізаваная афіцыйная ідэя непарушнасці першаклеткі *ўладар – раб*, на першапачатковым этапе культурагенезу фарміруецца ўжо народны дыскурс у жанравай форме апафатычнага набажэнства, апокрыфаў і ісіхасцкай практыкі *ўзаемапаразумення* свяшчэнна маўклівых. У беларускім варыянце *чалавек духоўны* не абмяжоўваецца маўклівым слупніцтвам. Задумны і Цікаўны, выгадаваныя ў сілавым полі гаспадарскай парадыгмы з часоў неалітычнай аграрнай рэвалюцыі, ва ўлонні саслоўна-каставага соцыуму па-ранейшаму трымаюць арыентацыю на ўніверсальны характар сэнсатварэння, на кантынуўмную працягненасць дзейнай радзіны і чалавечага роду. Устойлівы характар беларускага кананічнага стылю В. Ластоўскі імкнуўся апаэтызаваць у форме «Думы на Полацкім замчышчы»:

*Цьмы цьмоў і процьмы лет*
*На гэтым копішчы канодным*
*Складалі Дзеве чэсць.*
*Дзевін зваўся грод*
*і Дзевіна рака ў суток яго ручэла,*
*Бажніца Дзеве ў чэсць*
*На сонцы дахам снела,*
*здобячы сабой накоп.*
*У бажніцы ж перад дзевы стодам*
*хадзілі дзевы крагодам*
*у кудзебны тан.*
*Святарны хор павежнай мовай*
*Магутаў племені ўслаўляў.*
*Збіралі старцы тут*
*на раду й суд.*
*І быў нябесны ход*
*Людскім Законам,*
*Змацованым Правечным Конам…*
*Вось гэты лад пітомны*
*разбурыў крыжа знак…*
*Хай так,*
*а ўсё ж на попеле.*
*Старэтных стодаў,*
*Пад засцю ценяў іх*
*у почце грэчаскіх святых*
*засела Софас,*
*мясцовую сабой*
*змяняючы Паладу* [1, с. 208 – 209].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўмовах навейшага часу В. Ластоўскі ўзнавіў важнейшую ўласцівасць сацыяльнага быцця беларускай грамады – «нябесны ход Людскога Закону, змацаванага Правечным Конам». Выток ягонай мудрасці – Дзевіна рака, а значыць, – і сама Дзева – Дзіва – існаванне, ззянне святла, якое ўвасоблена ў вобразе Сафіі-мудрасці ў цемры сусветнага тэатра абсурду:

*Сядзьце роўна і пакорна:*
*Як калоды – так праворна,*
*Як у пні клін – так свабодна,*
*Як дамоўкі – так выгодна.*
*Ад граніцы да граніцы*
*Страж мая тут – паляўніца.*
*Дум згасіце ўсе праявы,*
*Цемра тут закон і права* [2, с. 226].

Нэарацыяналізм В. Ластоўскага прадугледжвае мужнае ўваходжанне цікаўнага даследчыка ў царства цемры і смерці – для таго, каб спасцігнуць на практыцы навуку пераадолення ўлады цемры. На гэтым напрамку ўжо былі сканцэнтраваны намаганні заснавальнікаў рэнесанснай і барочнай стылістыкі. Беларуская культура нашаніўскага перыяду рыхтавала душу звычайнага чалавека да тварэння прасветленай нівы з яе музыкай *струнаў прастору* (Я. Колас) і ціхім *шумам жытняга святла*. Аднак рэцэпты і інструкцыі апалагетаў радыкальнага індывідуалізму Хань Фэя, Макіявелі, Ніцшэ, як і фрэйдысцкі брутальны фізіялагізм, не зацікавілі дзеячаў беларускага руху: для беларускіх задумных і цікаўных адраджэнцаў арганічнай была арыентацыя на гуртавое засяроджанае перажыванне музыкі струнаў прастору, які таксама ўспрымаўся як жывая і мудрая існасць. В. Ластоўскі, У. Самойла, І. Канчэўскі бачылі вытокі і крыніцы гнасеалагічнай дынамікі ў дыяхроннай структуры міфалагічнай сюжэтыкі, у якой адлюстравана патрэба духу ў сінкрэтычным валоданні ісціны быцця. Такая інтэнцыя стымулявала ўжо ў 20-х гг. XX ст. праграму пашырэння і паглыблення дыялектнафіласофскага бачання быцця, стымулюючы тым самым развіццё аксюмароннай структуры сэнсаў і мэтаў азначвання існасці формулай «у нязмерных глыбінях нязмерныя высі» (У. Дубоўка).

Рознавектарная карціна быцця ў беларускай слоўнай культуры ўжо заняла сталае месца ў народнай паэзіі і прозе ў XVII – XVIII стст., калі рацыяналізм нізавога барока вызначыў семантыку асветніцкага рацыяналізму ў розных жанравых і антыжанравых формах прамовы, казання, блазоны, гавэнды, пародыі, дыярыуша, показкі, гутаркі, якія разлічаны на культуру штодзённага жыцця, прасякнутую імкненнем пачуць песню кулікоў у выцці завірухі і намацаць «галінамі сонца», прабіваючыся праз пліту замагільнага свету. Беларуская адраджэнская культура прапануе чалавецтву вопыт *пераплаўкі* ў душы напластаванняў энергіі цярпення,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

болю і пакуты ў энергію прасветленага дзеяння. Гэты накірунак быў падрыхтаваны фальклорным псіхааналізам і рэфлексіяй у жанрах гутарак-скаргаў, песняў-жальбаў XIX ст., пазаабрадавай лірыкай і трансфармацыяй абрадавай сюжэтыкі. Гэтыя тэндэнцыі вельмі выразна выступаюць у эвалюцыі рэпертуару жніўнай абрадавасці, у развіцці карнавалізавана-смехавога і містэрыяльна-трагедыйнага канону ў народным тэатры. Вопыт вуснай рэфлексіі ў апавяданнях казачнікаў Рэдкага, Старога дзеда Савіцкага, Матруны Бохмачыхі з'яўляецца не тольк феноменам мастацка-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці, але і формай народнай фенаменалогіі духу – своеасаблівым фальклорным дыскурсам, у якім раскрываецца драма і логіка самарэалізацыі суб'екта ў сферы духоўнай творчасці ў сітуацыі каланіяльнай залежнасці этнасу.

Такой атэстацыі цалкам заслугоўвае і фальклорна-асветніцкі раман у навелах Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня», на старонках якога паўстае вобраз «Беларусі ў фантастычных апавяданнях». Творы Я. Баршчэўскага прапануюць чытачу тыпалогію чалавечых характараў, адлюстраваную ў персаналіях міфалогіі, гісторыі і рэальнага часу, але яго найперш цікавіць гістарычная плынь свядомасці Сына Буры – задумнага, які застаўся ў духоўнай ізаляцыі пасля ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Аднак шляхціц Завальня па-гаспадарску збірае народную духоўную спадчыну. У гэтым – сутнасць яго натуры і прынцыповае адрозненне ад самотнага вандроўнага рамантыка, выхаванага на чужым духоўным грунце.

Я. Баршчэўскі мэтанакіравана імкнецца да інтэграцыі вопыту сакратаўскай пошукавай маеўтыкі з гаспадарскай парадыгмай беларускага фальклору. Класіфікацыя тыпаў духоўнага дзеяння ў творах Я. Баршчэўскага суадносіцца з гістарычнымі тыпамі свядомасці ў «Фенаменалогіі духу» Гегеля, але беларускага аўтара больш цікавяць перспектывы аздараўлення «няшчаснай свядомасці» ў беларускім Асветніцтве. Фальклорны дыскурс рыхтаваў грунт для пранікнення ў глыбіні свядомасці і падсвядомасці звычайнага чалавека – не толькі ў «тыповых» абставінах, але і ў крытычнай сітуацыі выбару рашэння. У пачатку XX ст. у фальклоры была створана кагнітыўная аснова для стварэння патэнцыялу духу і розуму ў сітуацыі *на дне* быцця ў абсалютнай цемры сацыяльных тупікоў і закуткаў душы. На гэтым рубяжы самаруху фарміраваўся экспрэсіяністкі стыль у беларускай эстэтыцы мастацтва. К. Чорны ў прызначанай для Л. Клейнбарта «Аўтабіяграфіі» пісаў у 1928 г.: «Галоўнае, што мучыць мяне з самых маладых год маіх, – гэта пакуты чалавека на зямлі, якія ў нас яшчэ не знішчаны і за знішчэнне якіх мы змагаемся. Гэта таму, што я выйшаў з самага "дна" нашага беларускага жыцця і з гэтым дном і цяпер звязаны духоўна і фізічна. Прынамсі – блізкія мне людзі і цяпер жывуць у гэтым дне» [3, с. 70].

Суб'ектывацыя творчага працэсу патрабавала ад асобы аўтара вялікіх рэсурсаў творчай і грамадзянскай мужнасці. На гэтым рубяжы ў XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сфарміраваўся адзін з важнейшых маральных імператываў, які стаў законам у эстэтычнай дзейнасці патрыятычнай беларускай інтэлігенцыі. У эстэтыцы беларускай моўнай творчасці навейшага часу гэтая норма паказана ў дынамічнай форме самаруху нацыянальнай контрсугестыі да сваёй завершанасці (энтэлехіі) у выглядзе тэзаўруса: «Так рупная пчала збірае мёд і з горкіх кветак» («Пчала», XII ст. ); «Гуслям, княжа, не пішуць законаў» (Я. Купала); «Я не магу вас песняй цешыць з абмытых бурамі эстрад» (М. Танк); «Лепш цяжка жыць, чым быць бадзёрым трупам» (А. Куляшоў). Кагнітыўны вопыт сучаснага беларускага семіёзісу заснаваны на гістарычных здабытках нацыянальнай генератыўнай семантыкі, глыбінныя сэнсы якой недаступны мовам іншанацыянальным у Беларусі, неарганічным у сілавым полі беларускамоўнага вобраза Сусвету.

На сучасным этапе прагрэс беларускай сацыякультурнай дынамікі залежыць ад здольнасці супольнага суб'екта скіраваць псіхагенез інтэлекту і душы на аднаўленне і актывізацыю культурнай памяці. Выключнае значэнне ў рэабілітацыі прынцыпаў прыродазгоднасці і культуразгоднасці. У дыдактыцы і выхаванні актыўных удзельнікаў «Берагіні» гэтыя прынцыпы штодзённа пашыраюць духоўныя далягляды навучэнцаў, умацоўваюць іх годнасць і пачуццё адзінства. Адной з найбольшых перашкод на гэтым напрамку з'яўляецца гіпастазіраванне ў вучонай педагогіцы, нізкі ўзровень яе рэфлексіі і кампенсацыя адсутнасці належнай актыўнасці духу мітуснёй фестывальных і конкурсных шоу. Пра пагрозу экалагічнай імітацыі ў народнай культуры не аднаразова папярэджвала Зінаіда Мажэйка: «Але ўсе сучасныя "наўколфальклорныя" і "постфальклорныя" формы з іх агульна дамінуючай забаўляльна-рэкрэатыўнай функцыяй адводзяць народазнаўчае і мастацтвазнаўчае згуртаванне ад экалагічнай трывогі і насцярожанасці ў бок бесклапотнага фалькларызму».

Усе падобнага роду разбурэнні З. Мажэйка аб'яднала зборнай назвай постфальклор. Да сказанага дабавім: намаганні прыдумаць для постфальклору нейкае тэарэтычнае апраўданне застаюцца марнымі і бездапаможнымі, як і нейкі «пазафіласофскі» квазіканцэптуалізм. Інтэлектуальная бездапаможнасць падобнай квазітэорыі выразна бачыцца на фоне здабыткаў педагогаў руху «Берагіня».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Ластоўскі, В. Выбраныя творы. – Мінск : Беларускі кнігазбор. – 512 с.
2. Купала, Я. Паэмы. Драматычныя творы. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 494 с.
3. Чорны, К. Зб. твораў у 8 тамах. Т. 8. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 616 с.
4. Мажэйка, З. Аўтэнтычны песенны фальклор і постфальклор // XV Міжнародны з'езд славістаў. Даклады беларускай дэлегацыі. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – С. 321–332.